Добрыя справы

Кулінарыя і сад для... рэабілітацыі

Добрым падарункам для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія пражываюць у Лепельскім раёне, стануць кулінарная і садоўніцкая майстэрні цэнтра сацыяльна-працоўнай, сацыяльна-бытавой і фізічнай рэабілітацыі інвалідаў. Адкрыццё запланавана на 3 верасня — у рамках святкавання Дня горада ў Лепелі.

Майстэрні створаны дзякуючы сумесным намаганням Лепельскага раённага выканаўчага камітэта, міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «ЭкаБудаўнік» і дабрачыннай арганізацыі Heim-statt Tschernobyl e.V. (Германія). Гуманітарны праект пры фінансавай падтрымцы нямецкага Федэральнага міністэрства па эканамічным супрацоўніцтве ажыццяўляецца з мая 2019 года, удакладнілі «Звяздзе» ў райвыканкаме. Яго мэта — паляпшэнне якасці і пашырэнне спектра сацыяльных паслуг для людзей з інваліднасцю з дапамогай умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы дзяржаўнай установы «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Лепельскага раёна».

У рамках рэалізацыі праекта і пабудавалі будынак кулінарнай і садоўніцкай майстэрань. У планах — узвядзенне Цэнтра сацыяльнай адаптацыі, рэабілітацыі, навучання, пражывання інвалідаў і часовага прытулку. Яго ўвод у эксплуатацыю намечаны на 2022 год.

Праект мае высокую грамадскую значнасць для рэгіёна ў цэлым, паколькі будаўніцтва названых аб'ектаў павысіць даступнасць абслугоўвання інвалідаў (у тым ліку і з сельскай мясцовасці) у аддзяленні дзённага знаходжання, падкрэслілі ў райвыканкаме.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Здароўе

«ЧОРНЫ ЖЭМЧУГ» ШУКАЙЦЕ Ў НЫРКАХ

Як экспертыза дапамагае ў лячэнні мочакаменнай хваробы

Згодна са статыстыкай, амаль кожны трэці пацыент уралагічных стацыянараў пакутуе на ныркова-каменную хваробу. Цвёрдыя крышталічныя рэчывы не толькі траўміруюць тканіны органаў, але могуць перакрыць мачаточнік, што прывядзе да поўнага адказу работы ныркі. Выхад адзін — выдаліць іх з арганізма. Камяні выходзяць як самастойна, так і праз хірургічнае ўмяшанне. Здаецца, праблема вырашана. Але ёсць верагоднасць, што працэс паўторыцца. Для таго каб засцерагчыся ад рэцыдыву, трэба ведаць хімічны склад свайго «брыльянта». Як расказала намеснік начальніка ўпраўлення лабараторных даследаванняў рэчавых доказаў біялагічнага характару ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гродзенскай вобласці Святлана МІЗЯНКОВА, такі аналіз набывае ўсё большую запатрабаванасць.

Даследаваць нырковыя камяні ў Гродне пачалі пяць гадоў таму. Да гэтага падобны хімічны аналіз праводзілі толькі ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі ў Бараўлянах. Новая магчымасць выклікала інтарэс у гродзенцаў. Чаму? Як аказалася, вынікі аналізу дапамагаюць урачам-уролагам разабрацца ў прычынах мочакаменнай хваробы і падабраць пацыенту адпаведную дыету. Бо мала хто хоча зноў перажыць пакуты нырковых колікаў. А між тым рэцыдывы здараюцца ў 70 % пацыентаў.

Штогод тут робяць да ста аналізаў хімічнага складу «брыльянтаў» — так некаторыя называюць гэтыя камяні з-за іх цяжкай здабычы. А фарміруюцца яны, як правіла, у выніку парушэння абменных рэчываў, траўмы нырак альбо інфекцыйных захворванняў. Прадукты харчавання таксама адыгрываюць у гэтым значную ролю.

І хоць мочакаменная хвароба вядома яшчэ з часоў егіпецкіх мумій, толькі ў XX стагоддзі была даказана дыягнастычная карысць устанаўлення хімічнага складу нырковага каменя для лячэння і прафілактыкі.

Як патлумачыла Святлана Мізянкова, ёсць некалькі відаў камянёў. У першую чаргу гэта фасфаты — нерастваральныя солі фосфарнай кіслаты, а таксама аксалаты — солі шчаўевай кіслаты. Яны адрозніваюцца і па цвёрдасці, і па трываласці, і па медыкаментознай растваральнасці. Фасфатныя і аксалатныя камяні цяжка паддаюцца растварэнню лекавымі прэпаратамі ў арганізме. Вельмі часта сустракаецца сумесная прысутнасць фасфатаў і аксалатаў. Таксама выяўляюцца ў камянях солі мачавой кіслаты — ураты. Радзей сустракаецца ксанцін. І амаль заўсёды ў склад усіх відаў камянёў уваходзіць кальцый.

— Усе ведаюць аб карысці кальцыю. Але не думаюць аб тым, што яго лішкі могуць назапашваць солі. Менавіта гэты кампанент — адзін з асноўных у нырковых камянях, таму не варта ўжываць яго без асаблівай патрэбы, — заўважае суразмоўніца.

Святлана Мізянкова дэманструе багатую «калекцыю» камянёў з нырак. Усе яны розныя па форме: круглыя, плоскія, з выступамі, з шыпамі. Па колеры — ад чорнага да жоўтага, памер таксама розны. Ад невялікіх крупінак да «марскіх» каменьчыкаў.

— Мы праводзім аналіз камянёў, якія выдалены хірургічным шляхам альбо выйшлі самастойна. Вядома, яны адрозніваюцца памерамі. Камень, які выходзіць самастойна, не большы, чым зерне грэчкі ці проса. Хірургічныя могуць дасягаць 2-3 сантыметраў у дыяметры. Калі іх разбіць ультрагукавым апарат на дробныя кампаненты, яны выходзяць і самастойна. Для аналізу камяні расціраем у парашок і праводзім якасную рэакцыю і мікракрышталескапію. Па відзе крышталікаў і вызначаецца склад соляў. На падставе аналізу ўрач можа даць рэкамендацыі, якія прадукты лепш ужываць, а ад якіх варта адмовіцца, — расказвае эксперт.

Напрыклад, калі камень аксалатны, варта выключыць з рацыёну шакалад, какаву, буракі, шчаўе, шпінат. Калі выяўлены ўраты, нельга ўжываць у ежу шпроты, каву, бараніну, свініну. Таксама ёсць рэкамендацыі па малочных прадуктах.

Запатрабаванасць у такіх аналізах сярод насельніцтва ўзрастае, заўважае суразмоўца. Хоць гэта працэдура платная: адзін аналіз каштуе 60 рублёў. Людзі звяртаюцца як самастойна, так і па рэкамендацыі ўрачоў-уролагаў. З імі эксперты таксама праводзяць сустрэчы, каб расказаць аб сваіх магчымасцях. Дарэчы, гродзенскія судовыя эксперты распрацавалі метадычныя рэкамендацыі па даследаванні хімічнага складу нырковых камянёў, якія ўключаны ў рэестр метадычных матэрыялаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. Цяпер такія аналізы праводзяцца і на базе іншых абласных упраўленняў ДКСЭ.

Вядома, толькі аналізу хімічнага складу нырковага каменя для лячэння недастаткова. Перш чым скласці дыету, збіраецца ўвесь анамнез пацыента, усе біяхімічныя паказчыкі. Але тып каменя падкажа ўролагам, як з ім працаваць. Напрыклад, калі ў чалавека выяўлены іёны амонію, значыць, ёсць нейкі запаленчы працэс. У жанчын мочакаменную хваробу можа справакаваць цяжарнасць, таму што ідзе гарманальная перабудова арганізма. Дзякуючы даследаванням судовых экспертаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, можна не толькі карэкціраваць харчаванне пацыента, але і прызначыць лекавую тэрапію для растварэння камянёў.

— Мочакаменная хвароба памаладзела, — заўважае Святлана Мізянкова. — Раней на яе пакутавалі людзі сярэдняга і сталага ўзросту. Цяпер нямала пацыентаў, якім 30—40 гадоў. Звяртаецца больш мужчын. А самым маладым пацыентам была студэнтка 1 курса медуніверсітэта.

Здарыўся яшчэ такі выпадак. Жанчына прынесла нырковыя камяні ў слоічку з-пад крэму «Чорны жэмчуг». Відаць, ставілася да іх як да каштоўнасці. А магчыма, яе «жэмчуг» быў напамінам аб тым, што арганізм патрабуе ўважлівага стаўлення да свайго здароўя.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Крымінал, здарэнні

Зарадная прылада справакавала пажар

Такая папярэдняя версія ўзгарання ў кватэры жылога дома ў вёсцы Падгор'е Магілёўскага раёна.

— У выніку пажару ў кватэры на першым паверсе стварылася шчыльнае задымленне ў пад'ездзе, — паведаміла падрабязнасці **старшы інспектар Цэнтра бяспекі жыццядзейнасці і ўзаемадзеяння з грамадскасцю МА УМНС Аляксандра ДАШКЕВІЧ.** — Агнём былі знішчаны канапа і пасцельныя рэчы, закурана маёмасць у кватэры. Пацярпелых, на шчасце, няма. Як мяркуецца, прычынай пажару стала падключаная да электрасеткі зарадная прылада ад мабільнага тэлефона.

Ратавальнікі папярэджваюць, што ні ў якім разе нельга пакідаць без нагляду падключанай да разеткі зарадную прыладу. Скокі напружання, тэхнічныя збоі могуць справакаваць яе загаранне. Для сваёй жа бяспекі выкарыстоўвайце арыгінальныя зарадкі. У час навальніцы трэба наогул адключаць зарадныя прылады ад сеткі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Ліцэіст пашкодзіў аўто з пнеўматыкі

Увечары ў Чачэрску кампанія маладых людзей праходзіла міма легкавога аўтамабіля. Пачуўся пляскач, і бакавое шкло аўто рассыпалася. Сведкам здарэння стаў супрацоўнік мясцовага РАУС.

Ён адразу выказаў здагадку, што ў каго-небудзь з хлопцаў у руках была пнеўматычная зброя. Незнаёмцы паспрабавалі збегчы, але міліцыянер здолеў затрымаць двоіх. Яшчэ аднаго злавіла гаспадыня аўто, чацвёртага знайшлі пазней.

На месца здарэння прыбыла следча-аператыўная група. Падчас агляду месца злачынства супрацоўнікі крымінальнага вышуку выявілі прадмет, падобны на пнеўматычны пісталет, паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Пазней высветлілася, што маладыя людзі прыехалі з гарпасёлка Карма ў Чачэрск на вучобу. З сабой у аднаго з іх, 16-гадовага хлопца, быў пнеўматычны пісталет. Ліцэіст вырашыў праверыць, як далёка страляе зброя. Куля трапіла ў шкло аўтамашыны, разбіўшы яго.

Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням непаўналетняга і распачалі крымінальную справу за хуліганства. Санкцыі артыкула прадугледжваюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ілжэмінёр — 16-гадовы падлетак

У аператыўна-дзяжурную службу УУС Гомельскага аблвыканкама паступіла паведамленне аб тым, што дом № 1 на плошчы Перамогі замініраваны.

Да месца здарэння адразу накіравалі нарады органаў унутраных спраў і іншыя экстранныя службы. У мэтах бяспекі ачапілі будынак і найбліжэйшыя тэрыторыі. Праводзілася эвакуацыя жыхароў дома.

Спецыялісты сапёрна-піратэхнічнай групы вайсковай часці 5525 унутраных войскаў МУС Беларусі праверылі памяшканні, выбуховых прылад знойдзена не было.

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі, што званок здзейсніў 16-гадовы юнак, навучэнец 11 класа адной з сярэдніх школ абласнога цэнтра.

Зараз у дачыненні да гараджаніна заведзена крымінальная справа за загадзя лжывае паведамленне аб небяспецы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Рэдкія экзэмпляры

Нямецкі маўзер 1939 года і вінтоўку Мосіна знайшлі ў Гродзенскай вобласці

Работнік ЖКГ пры дэмантажы даху ў г. п. Бераставіца ўбачыў прадмет, які нагадваў агнястрэльную зброю. Мужчына паведаміў аб гэтым у мясцовае аддзяленне міліцыі. Знаходка была накіравана на судовую балістычную экспертызу.

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік УДКСЭ па Гродзенскай вобласці Алена МІСЮКЕВІЧ, знойдзены прадмет з'яўляецца карабінам сістэмы Маўзер, выраблены заводскім спосабам. Агнястрэльнай зброі больш чым 80 гадоў. Але, нягледзячы на стан маўзера, карозію, драпіны і пацёртасць, ён прыдатны да стральбы. Захаваліся і маркіровачныя знакі — год выпуску, заводскі нумар, мадэль, а таксама іншыя вытворчыя таўро. Як паведамілі ў экспертным ведамстве, такія мадэлі даволі рэдка трапляюць на балістычную экспертызу. Эксперты прыгадалі яшчэ адзін нядаўні выпадак. На абследаванне трапіла агнястрэльная зброя, якую пры будаўнічых работах знайшоў жыхар Гродзенскага раёна.

Аказалася, што знаходка — складаныя часткі магазіннай вінтоўкі канструкцыі Мосіна ўзору 1891—1930 гадоў. Праўда, да выкарыстання па мэтавым прызначэнні яна не прыдатная.

Пры гэтым спецыялісты нагадваюць, што пры выяўленні зброі ці боепрыпасаў неабходна адразу паведаміць у праваахоўныя органы і дачакацца іх прыезду. Ні ў якім выпадку нельга браць сваю знаходку ў рукі, нават калі яна выглядае пашкоджанай альбо ржавай. І ў такім стане зброя можа быць небяспечнай.

Маргарыта УШКЕВІЧ.